# ДЫНАМІКА КОЛЬКАСЦІ ЎЧАСТКАЎ МІРАВЫХ ПАСРЭДНІКАЎ ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ ПАЛІТЫКІ САМАДЗЯРЖАЎЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (60–70-Я ГГ. XIX СТ.)

***С. А. Талмачова,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі*
*УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"*

Рэалізацыя аграрнай рэформы 1861 г. патрабавала стварэння спецыяльных мясцовых органаў улады і кіравання. «Палажэннем аб губернскіх і павятовых па сялянскіх справах установах» (далей – "Палажэнне") вызначалася іх структура, функцыянальныя абавязкі, парадак фарміравання кадравага складу і інш. [1]. Адным з важнейшых элементаў стаў інстытут міравых пасрэднікаў, на якіх ускладалася непасрэднае правядзенне урадавых мерапрыемстваў. Паветы падзяляліся на ўчасткі, у кожным з якіх дзейнічаў міравы пасрэднік.

У 1861 г. у 44 губернях Расійскай імперыі на 10 328 232 душ мужчынскага полу (рэвізскіх душ) былых прыгонных, не ўлічваючы былых дваровых людзей, было створана 1 714 участкаў міравых пасрэднікаў. Сярэдні памер участка па імперыі складаў 5 575 рэв. душ. Аднак па губернях ён вагаўся ад 899 у Аланецкай губ. да 13 387 рэв. душ у Пермскай губ. Гэта было звязана з рознай колькасцю насельніцтва ў пэўных рэгіёнах краіны. Так, ад 1 000 да 2 000 душ на ўчастак прыпадала ў Таўрычаўскай (1 347) і Астраханскай (1 837) губернях; ад 2 000 да 3 000 – у Екацерынаслаўскай (2 159) і Стаўрапольской (2 532); ад 3 000 да 4 000 – у пяці губернях; ад 4 000 да 5 000 – у васьмі, у тым ліку ў Гродзенскай (4 217) і Віцебскай (4 892); ад 5 000 до 6 000 – у сямі , у тым ліку Віленскай (5 545) і Мінскай (5 566); ад 6 000 да 7 000 – у дзесяці; ад 7 000 да 8 000 – у дзвюх; ад 8 000 да 9 000 – у чатырох губернях, у тым ліку Магілёўскай губ. (8 023). Больш за 9 000 рэвізскіх душ прыпадала на адзін участак міравых пасрэднікаў у Кіеўскай (10 433) і Пермскай (13 387) губернях [2, л. 5–6 адв.]. Такім чынам, колькасць былых памешчыцкіх сялян у адным участку міравога пасрэдніка ў беларускіх губернях у цэлым адпавядала сярэднім паказчыкам па 44 губернях Расійскай імперыі.

У 1863 г. пачалося скарачэнне міравых участкаў, спачатку толькі вакантных. Такія ўчасткі з'яўляліся, напрыклад, у выпадку выдалення ад пасады, хваробы ці смерці міравога пасрэдніка і інш. Адзначым, што ў гэты час урадам распрацоўваліся ўмовы земскай і судовай рэформ. Да таго ж у 1863 г. міналі два гады, адведзеныя «Общим Положением о крестьянах, вышедших из крепостной зависимости» (далей – «Агульнае палажэнне») ад 19 лютага 1861 г. [3] на складанне і зацвярджэнне ўстаўных грамат, у якіх фіксаваліся памеры сялянскіх надзелаў і павіннасцей, што выконваліся былымі прыгоннымі за карыстанне надзелам. Таму міністр унутраных спраў адзначаў у якасці прычын, з аднаго боку, значнае скарачэнне работы міравых пасрэднікаў, а з другога – імкненне паменшыць выдаткі будучых земстваў па ўтрыманні міравых устаноў, у тым ліку судовых.

У чэрвені 1863 г. МУС прапанаваў губернскім па сялянскіх справах прысутнасцям скарачаць колькасць участкаў міравых пасрэднікаў, асабліва там, дзе пражывала менш за 3,5 тыс. рэвізскіх душ [4, л. 4]. Міністр унутраных спраў лічыў мэтазгодным, каб на адзін участак прыпадала не менш за 6 000 рэв. душ. 15 ліпеня 1863 г. Галоўны камітэт аб уладкаванні сельскага стану згадзіўся на гэтую прапанову, але памер участка вызначыў інакш – не больш за 15 000 рэв. душ, таму што ў маланаселеных губернях участак у 6 000 рэв. душ мог мець занадта вялікую плошчу [2, л. 109–109 адв.]. У палажэнні Галоўнага камітэта ад 26 ліпеня 1863 г., вызначалася: «Предоставить губернским присутствиям, во всех тех случаях, где окажется удобным, уменьшить число мировых участков и составить предположения о новом распределении сих участков, с тем, чтобы в виду предстоящего подчинения мировым учреждениям крестьян имений государевых, дворцовых и удельных, было принято в соображение, при новом образовании участков, число означенных крестьян по тем уездам, в которых они находятся и чтобы размер каждого увеличиваемого участка не был более 15 000 ревизских душ», улічваючы не толькі былых памешчыцкіх, але і іншыя катэгорыі сялянства (дзяржаўных, дварцовых і ўдзельных) [5, с. 130; 6]. Губернскія па сялянскіх справах прысутнасці павінны былі скласці праекты новага размеркавання паветаў і прадставіць іх у МУС на зацвярджэнне. Адзначалася, што «уменьшение числа мировых участков производилось и производится постепенно» [5, с. 130]. У выніку да 1 кастрычніка 1865 г. у імперыі скарацілі да 400 участкаў [7, с. 57–58]. Пры абмеркаванні ў Дзяржаўным савеце пытання аб увядзенні ў дзеянне судовай рэформы 1864 г. высветлілася, што ў некаторых губернях засталіся невялікія па памеры і населенасці ўчасткі пасрэднікаў, таму «не представлялось затруднений к дальнейшему сокращению их» [8, с. 45]. 9 кастрычніка 1865 г. Міністэрства ўнутраных спраў прапанавала губернскім па сялянскіх справах прысутнасцям зноў разгледзець пытанне аб магчымасці далейшага змяншэння колькасці ўчасткаў міравых пасрэднікаў. У выніку ў губернях, дзе былі

адкрыты міравыя суды, памеры ўчасткаў былі даведзены да 30 тыс. рэв. душ, з адпаведнай ліквідацыяй участкаў [9, с. 36–37].

На тэрыторыі Беларусі працэс скарачэння колькасці ўчасткаў меў дадатковую палітычную афарбоўку і свае асаблівасці. Справа ў тым, што большасць міравых пасрэднікаў краю падтрымалі паўстанне 1863–1864 гг. У сакавіку 1863 г. міравыя пасрэднікі Гродзенскай губ. падалі міністру ўнутраных спраў калектыўнае прашэнне аб адстаўцы. У якасці прычыны яны назвалі недавер да іх дзейнасці з боку адміністрацыі і немагчымасць у такіх умовах працягваць выкананне сваіх абавязкаў [11, с. 328–330]. Віленскі генерал-губернатар 24 сакавіка 1863 г. пісаў міністру ўнутраных спраў, што прадвадзіцелі дваранства і міравыя пасрэднікі Гродзенскай губ. адзін за адным падавалі прашэнні аб адстаўцы. У. І. Назімаў меркаваў, што «подобного рода демонстрации со стороны местного дворянства могли бы быть обращены в пользу правительства, которому следует воспользоваться этим случаем, чтобы освободиться раз навсегда от влияния польского дворянства, присвоившего себе монополию по занятию всех правительственных мест членами своего сословия». Ён прапанаваў пазбавіць міравых пасрэднікаў тых «громадных привилегий», якімі яны карысталіся да той пары «в ущерб интересам правительства», и падпарадкаваць іх, як і чыноўнікаў земскай і гарадской паліцыі, губернатарам і генерал-губернатару ў якасці часовай меры ва ўмовах «исключительного положения, в котором находится край» [11, с. 337]. 27 сакавіка 1863 г. Гродзенскі губернатар генерал-маёр І. У. Галер дакладаў генерал-губернатару ў сувязі з адстаўкай міравых пасрэднікаў, што з усіх 38 міравых пасрэднікаў Гродзенскай губ. з 9 да 27 сакавіка 1863 г. падалі прашэнні 18 чал. з тых, каго губернатар унёс у спіс неблаганадзейных асоб. Ён адзначаў, што адначасовая падача прашэнняў мела «характар палітычны» і што ўсе яны, па яго меркаванні, могуць быць звольнены генерал-губернатарам без прадстаўлення ў Сенат, на падставе выдадзеных цыркуляраў. Пры гэтым губернатар адзначаў, што ў яго няма прапаноў адносна кандыдатаў на замяшчэнне вакансій і згаджаўся з прапановай Гродзенскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці (люты 1863 г.) аб ліквідацыі пасад міравых пасрэднікаў ці скарачэнні іх колькасці ў сувязі з заканчэннем з 1 мая 1863 г. часоваабавязаных адносін сялян да памешчыкаў і з пачаткам дзейнасці паверачных камісій, на якія ўскладалася правядзенне выкупных здзелак. Ён лічыў дастатковым пакінуць у павеце толькі па адным пасрэдніку для ўдзелу ў пасяджэннях названых камісій [11, с. 338–339]. Нагадаем, што законам ад 1 сакавіка 1863 г. у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай губернях ліквідаваўся часоваабавязаны стан сялян. Пры гэтым ствараліся паверачныя камісіі, на якія ўскладаўся шэраг абавязкаў, што выконвалі міравыя пасрэднікі. З гэтага часу абавязкі апошніх абмяжоўваліся галоўным чынам разборам спраў, што ўзнікалі паміж сялянамі па справах сялянскага самакіравання і вырашэннем спраў судова-паліцэйскага разбіральніцтва, вызначаных арт. 31 «Палажэння». Таму Віленскі генерал-губернатар лічыў карысным скараціць колькасць участкаў у самых шырокіх памерах, з падзелам паветаў на магчыма меншую колькасць участкаў [12]. Да таго, 9 красавіка 1863 г. У. І. Назімаў у адозве міністру ўнутраных спраў увогуле прапанаваў ліквідаваць інстытут міравых пасрэднікаў у краі. Ён лічыў, што іх удзел у рабоце паверачных камісій зусім не патрэбны, а абавязкі можна ўскласці на мясцовую земскую паліцыю. У. І. Назімаў прапанаваў пачаць пераўтварэнні з тых участкаў, дзе пасады міравых пасрэднікаў засталіся вакантнымі. Ён меркаваў, што калі ўсе пасрэднікі пададуць у адстаўку, то ўскладанне іх абавязкаў на мясцовых земскіх і павятовых спраўнікаў у хуткім часе адбудзецца ва ўсёй Гродзенскай губ. Затым гэту меру можна было б распаўсюдзіць на ўвесь край [11, с. 362–364]. З 18 красавіка 1863 г. вакансіі міравых пасрэднікаў у Гродзенскай, а затым і ў астатніх губернях сталі замяшчацца чыноўнікамі ад кароны праваслаўнага веравызнання “рускага паходжання” [11, с. 423–424; 13, л. 56–56 адв.; 14, л. 199 адв. – 201 адв.; 15, л. 34–39; 16, л. 130 –131; 17, л. 61 –61 адв.; 18, л. 54–56].

22 мая 1863 г. новы Віленскі генерал-губернатар М. М. Мураўёў у справаздачы міністру ўнутраных спраў адзначаў, што многія міравыя пасрэднікі самі прымалі ўдзел у паўстанні, карысталіся сваім уплывам на сялян для прыцягнення іх на свой бок. У сувязі з гэтым Віленскі генерал-губернатар загадаў у Віленскай і Гродзенскай губернях звольніць з пасад усіх міравых пасрэднікаў і кандыдатаў да іх, закрыць міравыя з’езды і спыніць выдачу жалавання міравым пасрэднікам. Такія ж меры распаўсюджваліся і на Мінскую губ., за выключэннем тых мясцовасцей, дзе губернатар прызнаваў магчымым захаваць міравыя ўстановы, а на пасады міравых пасрэднікаў былі прызначаны, як часовая мера, чыноўнікі ад урада, па выбары губернатара. У Віцебскай і Магілёўскай губернях прапанавалася звольніць з пасад і замяніць урадавымі чыноўнікамі толькі неблаганадзейных міравых пасрэднікаў [19, л. 3–3 зв.]. Так, у Інфляндскіх паветах Віцебскай губ. М. М. Мураўёў загадаў звольніць тых міравых пасрэднікаў, ва ўчастках якіх паверачныя камісіі знойдуць парушэнні ў складанні ўстаўных грамат [20, л. 2 адв. – 3].

Такім чынам, распараджэнне М. М. Мураўёва аб спыненні дзеянняў міравых пасрэднікаў супадала з меркаваннямі міністра ўнутраных спраў. Ён прапанаваў Віленскаму генерал-губернатару звярнуцца да Галоўнага камітэта з прадстаўленнем аб скарачэнні складу ўстаноў па сялянскіх справах [2, л. 11–11 адв.].

У выніку скарачэння міравых участкаў у пяці беларускіх паветах Віцебскай губ. з 17 міравых участкаў (у 1861 г.) у 1864 г. засталося 13. Мінская губ. была падзелена спачатку на 51 участак, а пасля новага размеркавання – на 26, у чатырох беларускіх паветах Віленскай губ. з 21 участка засталося 8. Аналагічная

карціна назіралася і ў 6 беларускіх паветах Гродзенскай губ. – у 1862 г. было 30, а ў 1864 г. засталося 17 участкаў [21, с. 72–73, 75–76, 78–79, 82–84; 22, с. 270–274; 23, л. 35–40; 24, 146–148; 25, с. 118, 121–122, 126, 130; 26, с. 146, 151–152, 157, 163; 27, с. 19–31; 28, с. 19–22]. У цэлым скарачэнне колькасці ўчасткаў міравых пасрэднікаў у пяці паўночна-заходніх губернях адлюстравана ў табліцы.

У адрозненне ад унутраных губерняў, у Заходнім краі працэс змянення колькасці міравых участкаў быў неадназначным. У сувязі з дзейнасцю паверачных камісій, якія правяралі правільнасць складання ўстаўных грамат, у 1865 г. тут было вырашана павялічыць пры неабходнасці колькасць міравых участкаў для больш паспяховага пераўтварэння ўстаўных грамат у выкупныя акты [31, с. 388–389]. Так, у Мінскай губ. у Ігуменскім, Мазырскім, Пінскім, Рэчыцкім і Слуцкім паветах было вырашана замест трох стварыць па чатыры участкі ў кожным з названых паветаў [32, л. 2–46].

***Табліца.*** **Скарачэнне колькасці ўчасткаў міравых пасрэднікаў з 1861 г. да 1 мая 1864 г. [5, с. 130 –131; 29; с. 11, 125, 135, 148, 162, 171, 183, 197, 209, 219, 227; 30, с. 75, 90, 100, 115, 128, 139, 152, 168, 181, 191, 201, 202]**

| Губерня | Першапачатковая колькасць у 1861 г. | Ліквідавана | Засталося ў 1864 г. |
|---|---|---|---|
| Віленская | 35 | 18 | 17 |
| Віцебская | 43 | 13 | 30 |
| Гродзенская | 39 | 17 | 22 |
| Мінская | 51 | 25 | 26 |
| Магілёўская | 34 | 3 | 31 |
| Усяго ў 31 губерні, па якіх меліся звесткі* | 1280 | 353 | 927 |

***Заўвага.*** Даных па Магілёўскай губ. у звестках МУС не ўказана. Колькасць участкаў адноўлена па іншых крыніцах, аднак усе выніковыя лічбы ўдакладнены з улікам даных па Магілёўскай губ.

Такім чынам, колькасць участкаў міравых пасрэднікаў залежала ад кадравай палітыкі ў адносінах да міравых пасрэднікаў і ад палітычнай кан'юнктуры. Падчас паўстання ўрад імкнуўся нейтралізаваць уплыў на сялян мясцовага дваранства рымска-каталіцкага веравызнання. Выбарнасць міравых пасрэднікаў і зацвярджэнне Сенатам кандыдатур змянілася прызначэннем іх Віленскім генерал-губернатарам, а маёмасны і адукацыйны цэнз, прафесійныя якасці – лаяльнасцю да ўлады.

Пасада міравога пасрэдніка заканадаўцамі меркавалася як часовая. Прадугледжвалася, што з заканчэннем складання ўстаўных грамат і пераводам сялян на выкуп неабходнасць у іх існаванні стане неактуальнай. Але гэтага не адбылося. Наадварот, з цягам часу ў міравых пасрэднікаў Беларусі стала больш абавязкаў. Так, пасля завяршэння работы паверачных камісій пачалася рэалізацыя рэформы дзяржаўных сялян, якія таксама сталі падпарадкоўвацца ведамству агульнай адміністрацыі, у тым ліку і міравых пасрэднікаў. Таму колькасць міравых участкаў пяці беларускіх губерняў у 1866 –1867 гг. павялічылася: у Віленскай губ. – з 17 участкаў (1864 г.) да 28 (1867 г.), адпаведна, у Віцебскай – з 30 да 37, Гродзенскай – з 22 да 31, Мінскай – з 26 да 35, Магілёўскай – з 31 (1864 г.) да 39 (1867 г.) [33, л. 110; 34 с. 190–214; 22, с. 270–274; 35, с. 21–25; 24, с. 146, 148; 30, с. 75, 90, 101, 115, 128, 139, 152, 168, 181, 191, 202; 36, 132, 133, 150, 168, 181, 182, 200, 213, 214, 228, 229, 242, 259, 276, 277, 292].

Такая колькасць участкаў міравых пасрэднікаў праіснавала нядоўга. На беларускія губерні распаўсюджвалася агульнарасійская тэндэнцыя па скарачэнні колькасці ўчасткаў. Асабліва гэта праявілася пасля перадачы міравому суду судовых функцый міравых пасрэднікаў у сувязі з распаўсюджаннем судовай рэформы 1864 г.

З 21 студзеня 1870 г. губернскім установам прапанавалася зноў паменшыць колькасць міравых участкаў. Гэта пастанова была вынікам зацверджанага царом меркавання Дзяржаўнага савета ад 15 мая 1869 г. аб прыняцці мер да скарачэння выдаткаў на сялянскую справу ў сувязі са змяншэннем і заканчэннем работ па выкупной аперацыі [37, л. 73–74]. У законе нават было адзначана: «Предоставить министру внутренних дел, сколь возможно, представлением своего заключения об окончательном устройстве дел, возложенных на местные по крестьянским делам учреждения, в видах безотлагательного приступа к постепенному упразднению должности мировых посредников и их съездов» [38, с. 178]. Такім чынам, афіцыйна быў вызначаны агульны кірунак урадавай палітыкі ў дачыненні да інстытута міравых пасрэднікаў.

6 кастрычніка 1870 г. Віленская губернская па сялянскіх справах прысутнасць пастанавіла скараціць па аднаму ўчастку ў Віленскім, Свянцянскім, Дзісненскім, Лідскім і Трокскім паветах, у якіх засталося па тры міравых пасрэднікі, а 3 снежня 1871 г. па тры ўчасткі засталося і ў Ашмянскім і Вілейскім паветах [39, л. 2–3 адв., 7 -7 адв.]. 8 сакавіка 1875 г. Віленская губернская па сялянскіх справах прысутнасць палічыла магчымым

скараціць яшчэ пяць участкаў – па аднаму ў Ашмянскім, Віленскім, Дзісненскім, Свянцянскім і Трокскім паветах [39, л. 12]. Гродзенская губернская па сялянскіх справах прысутнасць 11 мая 1870 г. пастанавіла скараціць па аднаму ўчастку ў Беластокскім і Сакольскім паветах, а 12 студзеня 1872 г. было прынята рашэнне аб ліквідацыі яшчэ па аднаму ўчастку ў Гродзенскім, Кобрынскім, Слонімскім і Брэсцкім паветах [40, л. 6-6 адв., 11–11 адв.]. Аналагічны працэс адбываўся і ў астатніх губернях краю.

Такім чынам, ішоў працэс паступовага скарачэння колькасці ўчасткаў міравых пасрэднікаў. Адзначым, што яшчэ ў 1868 г. новы міністр унутраных спраў А. Я. Цімашаў склаў дакладную запіску аб неадкладным скасаванні пасады міравых пасрэднікаў і размеркаванні іх функцый паміж судовымі органамі, павятовай паліцыяй і асаблівымі папячыцелямі над сялянствам, прызначанымі з мясцовых памешчыкаў і падначаленых губернатару. Аднак гэты праект не быў зацверджаны. У 1873 г. А. Я. Цімашаў прадставіў у Галоўны камітэт новы праект аб паступовым скасаванні інстытута міравых пасрэднікаў. Міністр унутраных спраў лічыў гэту пасаду мала карыснай, нават зусім лішняй, уяўляўшай значную перашкоду для дзейнасці губернскай адміністрацыі [46, с. 37].

Праект 1873 г. абмяркоўваўся ва ўрадавых колах і выліўся ў форму закона ад 27 чэрвеня 1874 г., па якім ва ўнутраных губернях інстытут міравых пасрэднікаў быў ліквідаваны [41, л. 37]. У Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях гэта адбылося ў 1878 г. У трох губернях Віленскага генерал-губернатарства пасада міравога пасрэдніка захавалася да канца 1903 г., калі яго функцыі былі перададзены земскім начальнікам. Працэс скарачэння колькасці ўчасткаў міравых пасрэднікаў працягваўся. З 1 студзеня 1879 г. у Віленскай і Гродзенскай губернях іх засталося па два на павет [42, л. 20–21; 43, л. 3].

Такім чынам, можна зазначыць, што ў заходніх губернях палітыка ўрада адносна міравых пасрэднікаў мела свае асаблівасці, што можна прасачыць па шматлікіх паказчыках, у тым ліку па змяненнях у колькасці ўчасткаў міравых пасрэднікаў. У заходніх губернях гэтыя змены насілі хвалепадобны характар. Так, адразу пасля паўстання 1863–1864 гг. колькасць участкаў у цэлым скарацілася амаль у 2 разы, да 1867 г. зноў узрасла, але не перавысіла паказчыкі 1861 г., а потым з 1871 г. зноў пайшоў працэс скарачэння ўчасткаў міравых пасрэднікаў. Гэтыя змены былі абумоўлены павелічэннем ці памяншэннем паўнамоцтваў міравых пасрэднікаў.

## 🕮 БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). – 2-е собр. – Т. 36 (1861). – Отд. 1. – № 36660.
2. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў, г. Санкт-Пецярбург (далей – РДГА). – Ф. 1181. Воп. 1. Спр. 82. – 114 л.
3. ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 36 (1861). – Отд. 1. – № 36657.
4. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў, г. Вільнюс (далей – LVIA). – F. 439. – Ap. 1. – B. 20.
5. Обзор действий Министерства внутренних дел по крестьянскому делу с января 1861 по 19 февраля 1864 года / М-во внутренних дел. – СПб., 1864. – [6], 201 с.
6. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 38 (1863). – Отд. 1. – № 39915.
7. Сборник правительственных распоряжений по устройству быта крестьян, вышедших из крепостной зависимости. – СПб. : Земский отд. М-ва внутр. дел, 1861–1876. – Т. 6. – Ч. 2 : с 1-го июля 1865 по 1-е января 1866 года. – 1866.
8. Катаев, М. М. Местные крестьянские учреждения 1861, 1874 и 1889 гг. : (Ист. очерк их образования и норм деятельности) : Ко дню пятидесятилет. годовщины освобождения крестьян от крепостной зависимости 19 февр. 1911 г. : в 3 ч. / сост. М. М. Катаев. – СПб. : Зем. отд. МВД, 1911 –1912. – Ч. 2. – 1911.
9. Сборник правительственных распоряжений по устройству быта крестьян, вышедших из крепостной зависимости. – СПб. : Земский отд. М-ва внутр. дел, 1861–1876. – Т. 12 : с 1 января 1871 по 1 января 1873 года. – 1873.
10. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 38 (1863). – Отд. 1. – № 39915.
11. Музей графа М. Н. Муравьева. Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863–1864 гг. в пределах Северо-Западного края : в 2 ч. – Вильна, 1913–1915. – Ч. 1: Переписка по политическим делам гражданского управления с 1 января 1862 по май 1863 г. / сост. А. И. Миловидов. – 1913.
12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, г. Мінск (далей – НГАБ). – Ф. 242. Воп. 1. Спр. 415.
13. РДГА. – Ф. 1267. Воп. 1. Спр. 5. – 106 л.
14. РДГА. – Ф. 1267. Воп. 1. Спр. 6. – 263 л.
15. РДГА. – Ф. 1267. Воп. 1. Спр. 7. – 84 л.
16. РДГА. – Ф. 1267. Воп. 1. Спр. 8. – 193 л.
17. РДГА. – Ф. 1281. Воп. 6, 1864 г. Спр. 35. – 159 л.
18. РДГА. – Ф. 1281. Воп. 7, 1865 г. Спр. 34. – 156 л.
19. РДГА. – Ф. 1291. Воп. 36. 1863 г. Спр. 33.

20. РДГА. – Ф. 908. Воп. 1. Спр. 171. –36 л.
21. Памятная книжка Витебской губернии на 1862 год. – Витебск : В Типографии губернского правления, 1862.
22. Памятная книжка Витебской губернии на 1864 год / под ред. А. М. Сементовского. – СПб. : В типографии К. Вульфа, 1864.
23. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 1. Спр. 68. – 47 л.
24. Памятная книжка Минской губернии на 1864 год. – Минск : Губернская типография, 1864.
25. Памятная книжка Виленской губернии на 1862 год. – Вильна : В типографии А. Сыркина, 1862.
26. Памятная книжка Виленской губернии на 1864 год. – Вильна : В типографии А. Сыркина, 1864.
27. Памятная книжка Гродненской губернии на 1862 год. – Гродно : В Типографии Гродненского губернского правления, 1862.
28. Памятная книжка Гродненской губернии на 1864 год. – Гродно : В Типографии Гродненского губернского правления, 1864.
29. Памятная книжка Могилевской губернии на 1862 год. – Могилев, 1862.
30. Памятная книжка Могилевской губернии на 1864 год. – Могилев, 1864.
31. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 40 (1865). – № 41978.
32. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 1. Спр. 423. – 49 л.
33. LVIA. – F. 380. Ap. 1. B. 380.
34. Памятная книжка Виленской губернии на 1867 год. – Вильно : В типографии А. Сыркина, 1867.
35. Памятная книжка Витебской губернии на 1867 год / под ред. А. М. Сементовского. – СПб. : В типографии К.Вульфа, 1867.
36. Памятная книжка Могилевской губернии на 1867 год. – Могилев : Типография Губернского правления, 1867.
37. РДГА. – Ф. 1291. Воп. 38,1885 г. Спр. 20.
38. ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 45 (1870). – Ч. 1. – № 48044.
39. РДГА. – Ф. 1291. Воп. 36, 1870 г. Спр. 167 –23 л.
40. РДГА. – Ф. 1291. Воп. 36, 1870 г. Спр. 110 –27 л.
41. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 1. Спр. 1604.
42. РДГА. – Ф. 1149. Воп. 10, 1888 г. Спр. 41.
43. РДГА. – Ф. 1291. Воп. 38, 1878 г. Спр. 32 –36 л.
44. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 1. Спр. 629. – 277 л.
45. РДГА. – Ф. 1291. Воп. 66, 1866 г. Спр. 54–40 л.
46. Дружинин, Н. М. Русская деревня на переломе, 1861–1880 гг. / Н. М. Дружинин. – М. : Наука, 1978 – 287 с.

# НАЧАЛО ФОРМИРОВАНИЯ ЗАПАДНОЙ ГРАНИЦЫ РУСИ

***С. Н. Темушев,***
*кандидат исторических наук, доцент,*
*доцент кафедры истории России*
*Белорусского государственного университета*

В своё время крупнейший советский историк В. Т. Пашуто однозначно утверждал: «Граница с Польшей – древнейшая среди русских границ» [13, с. 31]. Западная граница Руси включала территории, отличавшиеся по составу населения (включая этническую принадлежность), традициям общественно-политического развития и физико-географическим условиям, а именно: Перемышльскую, Белзскую, Червенскую, Берестейскую, Дорогичинскую земли, а также Ятвягию. На всем протяжении эти территории с конца X в. оказались сопредельными Польскому государству. Окончательно русско-польская межгосударственная граница определилась к середине XI в., когда киевский князь Ярослав Владимирович помог польскому князю Казимиру I Восстановителю покорить мазовшан (1047 г.) [14, с. 68] и, возможно, тогда же окончательно закрепил за собой Понёманье.

Обстоятельства формирования русско-польской границы представляют собой прекрасную иллюстрацию складывания государственной территории двух государств, обусловленное стремлением распространить данническую зависимость на как можно большую территорию.

Форпостом Руси в сторону Мазовии стал Дрогичин над Бугом. Специалисты относят начало «дрогичинского поселенческого комплекса» к X в., но нижний слой городища датируется XI веком. Ко времени первого упоминания в летописи Дрогичина – 1142 г. – город уже был довольно развитым древнерусским центром [21, s. 23]. О пограничном характере Дрогичина над Бугом свидетельствуют многочисленные находки свинцовых товарных пломб [2, с. 46]. При этом слабая заселенность окрестностей объясняет то обстоятельство, что